# Як настроілі, так грае

**Ці працуе старадаўняя прыказка сёння? “Культура” вырашыла высветліць, як настроены на працу музычныя школы, на чым граюць навучэнцы і што за праблемы хвалююць педагогаў.**



**Лілія Арамаўна ХАЧАТУРАВА,** *намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Маладзечанскан дзіцячай школы мастацтваў:*

**-** Ва ўсіх нашых кабінетах есць інструменты. Не так даўно набылі два новыя фартэпіяна “Беларусь”, два лічбавыя фартэпіяна, скрыпкі, флейты. Інструменты неабходна перыядычна мяняць, бо імі пастаянна карыстаюцца, навучэнцаў шмат. Большасць фартэпіяна пакуль яшчэ старыя, хацелася б новыя купіць. Але ўсё адразу мы ахапіць не можам. Таксама патрэбны раяль.

У школе ладзіцца шмат творчых спаборніцтваў, канцэртаў і разнастайных праграм. У мінулым годзе праводзілі рэспубліканскі конкурс “Веснавы праменьчык”, сёлета — “Свята саксафона”.

У працэсе навучання ўвесь час з’яўляюцца новыя тэхналогіі: увялі камп’ютарную музыку, адкрылі эстрадны клас.

У нашай установе больш за 700 навучэнцаў, але з педагогамі праблем не ўзнікае. Супрацоўнікаў хапае. Да таго ж штат перыядычна папаўняецца маладымі спецыялістамі.



**Наталля Казіміраўна ГОБРЫК**, *дырэктар дзіцячай музычнай школы № 3 г. Баранавічы*:

— Навучэнцы, як правіла, карыстаюцца ўласнымі інструментамі. Бо дзіця не толькі займаецца на ўроках, але і выконвае дамашнія заданні. Школьныя інструменты ў добрым стане. Нядаўна купілі новыя фартэпіяна, гітары, саксафоны, кларнеты, трубы. Цяпер думаем пра набыццё акардэонаў. Аддзел культуры і выканкам па магчымасці спрыяюць у гэтым пытанні. Калі бюджэтных сродкаў не хапае, мы звяртаемся да пазабюджэту.

Школа імкнецца быць болей сучаснай, разнастайнай, таму маем электраінструменты, напрыклад два лічбавыя сінтэзатары. Музыку такіх кірункаў, як джаз, дзеці вучацца граць і пад фанаграму.

Хацелася б закупіць скрыпкі розных памераў: кожнаму навучэнцу патрэбен свой. А ў нас ёсць толькі невялікія інструменты для малодшых класаў.

Ва ўстанове выдатны педагагічны склад, які перыядычна папаўняецца маладымі спецыялістамі. Было б цудоўна, калі б яшчэ ўрэгулявалі праблему канцэртмайстраў. У гэтых работнікаў — вялізныя перапрацоўкі і толькі 32 дні адпачынку.

Сярод пакуль не вырашаных пытанняў і тое, што даводзіцца ўвесь час даказваць бацькам і калегам з агульна-адукацыйных устаноў важнасць і неабходнасць нашай справы. На жаль, сутыкаемся з недастатковым разуменнем.



**Таццяна Лявонцьеўна СЛАГОДА**, *дырэктар Салігорскай дзіцячай музычнай школы мастацтваў*:

— Набываем інструменты, дзякуючы праграме "Культура Беларусі". Апошняя закупка прайшла летась. Паступова стараемся замяняць фартэпіяна: у школе іх больш за 40, а новых толькі 5. Але самую вялікую патрэбу маем у раялях. Яны ў нас ёсць, але эксплуатуюцца безупынна: пастаянныя рэ- петыцыі, канцэрты... Чула, што гэтыя інструменты сталі рабіць на фабрыцы, дзе выпускаюць піяніна "Беларусь". Па водгуках — добрыя. Хацелася б арганізаваць пастаўку ў нашу школу.

Нягледзячы на тое што мы класічная ўстанова, імкнёмся быць сучаснымі і ўводзім новыя музычныя кірункі. Напрыклад, адкрылі клас сінтэзатара.



**Таццяна Мікалаеўна Барзова**, *дырэктар дзіцячай школы мастацтваў № 1 г. Жлобіна*:

— Інструменты для навучання ў нас ёсць. За апошні год школа набыла пяць скрыпак, ксілафон, балалайку і чатыры гітары, тры з іх — чатыры чвэрці (стандартны памер), адна — тры чвэрці (для маленькіх). Усё гэта куплялася за пазабюджэтныя сродкі. Хацелася б яшчэ баян, віяланчэль і раяль. Але пакуль што няма магчымасці. Кошт баяна — ад 3 000 рублёў, віяланчэлі — ад 2 000, раяля — 50 000—60 000 рублёў.

Кадрамі школа забяспечана добра. Мы супрацоўнічаем з гомельскімі і мазырскімі ўстановамі адукацыі. Калі патрабуецца, робім запыт — і да нас прыходзяць маладыя спецыялісты. Гэтае пытанне заўсёды вырашаецца па меры ўзнікнення.

Здараюцца складанасці з пошукам навучэнцаў. Бацькі цяпер менш зацікаўленыя. Але мы імкнёмся прыцягнуць увагу дзяцей, ладзім разнастайныя канцэрты ў школах, садках. На дадзены момант у нас 541 апекаванец. Ахопліваем і сельскую мясцовасць: адкрыты класы ў Саланым, Ніве, Чырвоным Беразе, Бабоўцы, філіял у Пірэвічах. Праўда, узнікаюць праблемы з транспартам. У некаторыя куткі цяжка дабірацца. Бывае, настаўнікам даводзіцца ездзіць на заняткі на таксі. Школа імкнецца ісці ў нагу з часам. Выкарыстоўваем у навучанні новыя музычныя тэхналогіі, праграмы. Гэта, напрыклад, ігра на электронным піяніна, пад фанаграму. У нас вялікі выбар жанраў. Выконваем як класіку, джаз, такі сучасныя кампазіцыі.



**Наталля Леанідаўна САПЕЛКІНА**, *дырэктар Слуцкай дзіцячай школы мастацтваў*:

— Дзякуючы нашаму абласному ўпраўленню большую частку інструментаў мы абнавілі: домры, электрафартэпіяна, бас-, сола-гітары, электрагітары, мандаліны, трубы, тэнары, саксафоны, кларнеты, ксілафон, ударныя ўстаноўкі. Адзінае, чаго пакуль не стае,

— гэта якасны канцэртны баян. Яго кошт — каля 20 000 $.

Вельмі хацелася б увесці сучасныя кірункі ў навучанні, аднак надзвычай складана знайсці педагогаў па гэтых спецыяльнасцях. Тыя ж бас-гітарысты, клавішнікі павінны быць адмыслова падрыхтаваныя, мець не толькі класічную адукацыю.

Але самая вялікая праблема — музычныя школы губляюць папулярнасць. Усё часцей бацькі скардзяцца, што дзіцяці цяжка, што навучанне займае шмат часу. Даводзіцца тлумачыць, наколькі важныя веды, якія мы даём.

Ганна САКАЛОВА

Культура. — 2023. — 18 лют. — С. 5.